характарызуе персанажа, істотна ўплываючы на закончанасць лялечнага вобраза.

У нетрах народнай культуры сфарміраваліся розныя віды тэатральнага мастацтва беларусаў, шматлікія яго формы. Гульня чалавека з лялькай, якая з'явілася задоўга да тэатра лялек, вызначыла першапачатковыя элементы сцэнічнай выразнасці лялечнага тэатра. Лялькі і іх механізацыя, іх адказныя ролі ў рытуалах і абрадах, увасабленне ў лялечных вобразах жывёл і людзей, актыўны ўдзел чалавека ў дзействах з лялькамі — ва ўсім гэтым выразна відаць прыёмы лялечнага тэатра, якія мы з цікавасцю назіраем сёння на прафесійнай сцэне.

**Спірыдовіч В.Т.,**
*аспірантка кафедры філасофіі і гісторыі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СІСТЭМА АДУКАЦЫІ Ў ЕЗУІЦКІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ БЕЛАРУСІ XVI–ПАЧ. XIX СТАГОДДЗЯЎ

Важнае месца ў фарміраванні беларускай духоўнасці, нацыянальнай свядомасці належыць сістэме адукацыі. Сёння вызначаны новыя падыходы ў адукацыйнай палітыцы, галоўныя напрамкі якой — фарміраванне нацыянальнай сістэмы адукацыі, павышэнне самастойнасці і ініцыятывы вучэбных устаноў, іх цесная інтэграцыя з навукай, вытворчасцю, культурай. Перабудова вышэйшай адукацыі непарыўна звязана з гуманітарызацыяй навучальнага працэсу. У яго аснову пакладзены далучэнне студэнцкай моладзі да духоўных каштоўнасцей беларускай і сусветнай культур, узмацненне агульнакультурнай, экалагічнай, прававой, эстэтычнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Адным з напрамкаў гуманітарызацыі з'яўляецца вывучэнне гісторыі і культуры беларускага народа, адраджэнне яго гістарычных, культурных і навуковых традыцый. Задача культуролагаў і гісторыкаў, на наш погляд, заключаецца ў тым, каб не толькі аднавіць і захаваць памяць аб культурна-гістарычнай спадчыне, але і пераняць тое станоўчае, што збіралася беларускім і іншымі народамі на працягу стагоддзяў.

Усё вышэйадзначанае датычыцца і ордэна езуітаў, адным з галоўных задач якога былі выхаванне і адукацыя моладзі. Аб гэтым сведчыць тое, што адна з частак статута езуітаў была прысвечана адукацыі. Але больш дакладна аб езуіцкай сістэме адукацыі гаворыцца ў падрыхтаваным пасля генеральнай кангрэгацыі 1581 г. "Спосабе і ладзе навучання" (Ratio atque institutio studiorum), якога з 1599 г. абавязаны былі прытрымлівацца ўсе езуіцкія навучальныя ўстановы.

Класічны характар адукацыі краін Еўропы таго часу тлумачыўся тым, што асноўным зместам яе сістэмы было вывучэнне лацінскай мовы (мовы ўсёй адукаванай Еўропы таго часу), грэчаскай мовы, паэтыкі, рыторыкі, антычнай літаратуры і міфалогіі. Адукацыйная сістэма езуітаў мела яскравы гуманітарны накірунак і грунтавалася на пэўных метадалагічных прынцыпах, якія, на наш погляд, могуць быць цікавымі для педагогаў і выкладчыкаў нашага часу. Гэта прынцып канцэнтрацыі, які патрабаваў засяроджання на адной граматычнай альбо моўнай форме, каб дабіцца поўнага яе засваення; прынцып практычнасці, які грунтаваўся на выкарыстанні вывучанага ў жыцці; прынцып паступовага ўскладнення заданняў; прынцып недапушчальнасці перагрузкі і інш. На ўроках мовы вучням забаранялася выкарыстоўваць родную мову ў зносінах паміж сабою. Гэта рабілася для практычнага авалодання іншымі мовамі. У наш час такая методыка мае назву "метад паглыблення" і знаходзіць выкарыстанне ў паскораным вывучэнні моў.

Адразу ж неабходна падкрэсліць, што існуюць розныя і нават процілеглыя ацэнкі гісторыкамі дзейнасці езуітаў у галіне адукацыі. Некаторыя даследчыкі лічаць, што сістэма адукацыі езуітаў мела антысацыяльны характар. Другія лічаць (і мы прытрымліваемся гэтага ж пункту гледжання), што езуіцкая сістэма адукацыі, пабудаваная на шматгадовым вопыце найлепшых еўрапейскіх універсітэтаў і прагрэсіўных ідэях славутых педагогаў, на той час не мела сабе роўных. Яна пашыралася па ўсёй Еўропе і дамінавала над усімі іншымі адукацыйнымі сістэмамі.

Улічваючы тое, як доўга навучальныя ўстановы езуітаў у Беларусі захоўвалі свой прэстыж, з якімі выдатнымі імёнамі звязана дзейнасць езуіцкіх калегіюмаў і акадэмій, мы лічым, што нельга адназначна адказаць на пытанне: "Адмоўную ці станоўчую ролю адыгралі езуіты ў справе адукацыі?" Паспрабуем зрабіць невялікі аналіз сістэмы адукацыі езуітаў на прыкладзе некаторых навучальных езуіцкіх устаноў Беларусі.

Так званыя поўныя агульнаадукацыйныя навучальныя ўстановы езуітаў складаліся з двух аддзяленняў: пяцікласнай гімназіі (studia inferiora) і старшага аддзялення (studia superiora). У класах аддзяленняў вывучалі: 1 — infima, на якой вучылі чытаць і пісаць, скланенню і спражэнню ў лацінскай мове; 2 — grammatica (этымалогія лацінскай мовы). У гэтым класе чыталі "Энеіду" Вергілія, "Аб сяброўстве" Цыцэрона, на занятках па грэчаскай мове чыталі байкі Эзопа; 3 — sintaxis (правілы лацінскай канструкцыі); 4 — poetica (правілы лацінскага і польскага вершаскладання). Вывучэнне паэтыкі грунтавалася на антычным паэтычным і прамоўніцкім мастацтве, каментары. Акрамя гэтага, вывучаліся прыстасаваныя да школьнай праграмы працы Арыстоцеля, "Навука паэзіі" Гарацыя, "Дванаццаць кніг рытарычных настаўленняў" Квінтыліяна, тэорыі мастацкай творчасці Платона і іншых антычных аўтараў. Выкарыстоўваўся курс аднаго з выдатных заходнееўрапейскіх літаратуразнаўцаў П.Скалігера

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

“Сем кніг паэтыкі”, а таксама курсы езуіцкага тэарэтыка Якаба Пантана. Паэтыка падводзіла непасрэдна да вывучэння рыторыкі (rethorica), якая вывучалася ў пятым класе. Класам рыторыкі заканчвалася навучанне ў гімназіі. Чыталі творы Сенэкі, Тацыта, Лівія, Дэмасфена, Гамера.

Акрамя гэтага, вывучаліся геаметрыя, гісторыя, асновы матэматыкі, мастацтва, беларуская мова і інш.

Старшае аддзяленне — вышэйшая ступень тыпу гуманітарнага універсітэта. Яго першым узроўнем быў курс філасофіі, другім — курс тэалогіі, на які паступалі найбольш здольныя вучні, што скончылі папярэднія класы і рыхтаваліся стаць кандыдатамі ў духоўны сан.

Пры некаторых калегіюмах былі складзены канвікты для беднай і багатай шляхты. У іх выкладаліся такія ж навукі, як і ў польскай свецкай школе.

Значнасць езуіцкіх навучальных устаноў год ад году ўзрастала. Гэта датычыцца і Полацкага калегіюма, тут маглі вучыцца жадаючыя з усёй Беларусі. У калегіюме выкладаў паэтыку і рыторыку Мацей Казімір Сарбеўскі — выдатны паэт і тэарэтык літаратуры, творы якога друкаваліся ў буйнейшых гарадах Заходняй Еўропы. З 1626 г. Сарбеўскі чытаў універсітэцкія курсы па тэорыі паэзіі, мастацтве красамоўства і па міфалогіі. На падставе прачытаных лекцый Сарбеўскі напісаў трактаты пад агульнай назвай “Аб дасканалай паэзіі, або Віргілій і Тэрэнцый”, “Курс паэтыкі”, а таксама даследаванні па антычнай міфалогіі пад назвай “Багі язычнікаў”.

Пры калегіюме дзейнічалі дабрачынныя ўстановы: багадзельні для састарэлых і прытулак для беднай шляхты.

Нам вядомы толькі агульныя даныя навучэнцаў па ўсёй Рэчы Паспалітай з 1616 года. Па некаторых звестках, у Польшчы і Літве было каля 8 — 10 вучняў як у акадэмічных, так і ў езуіцкіх установах. Апошніх налічвалася да 36. З іх сем размяшчаліся на тэрыторыі Беларусі: у Оршы, Бабруйску, Брэсце, Гродне, Нясвіжы, Полацку, Пінску. Езуіцкая адукацыя пашыралася хуткімі тэмпамі. Да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сярэдзіны XVII стагоддзя на Беларусі існавала 9 вышэйшых навучальных устаноў гуманітарнага тыпу, блізкіх да універсітэта.

Цяжкасці ў даследаванні дзейнасці непасрэдна Полацкага калегіюма ў XVII стагоддзі тлумачацца нястачай матэрыялу, што выклікана няспыннымі ў другой палове XVII стагоддзя войнамі. Вядома, што з 1653 г. па 1667 г. калегіюм практычна не працаваў. Аднак гэта не перашкодзіла ў хуткім часе аднавіць дзейнасць і запрасіць у калегіюм "прафесараў-эрудытаў": С.Кнапскага, М.Бенедыкта, К.Каяловіча, М.Вайцэхоўскага. У першай палове XVIII стагоддзя ў калегіюме выкладалі І.Корсак (тэалогію), С.Вяржбіцкі (матэматыку і этыку). У 1751 г. у калегіюме выкладаў прафесар Віленскай акадэміі, выдатны вучоны Марцін Пачобут.

У другой палове XVIII стагоддзя ў сістэме навучання і выхавання езуітаў адбыліся сур'ёзныя змены. Гэта абумоўлена тым, што ў 60-я гады ў Літве і Беларусі з'яўляюцца школы і вучылішчы піярскага ордэна, сістэма выкладання ў якіх адрознівалася ад езуіцкай. Уплыў піяраў быў настолькі моцны, што езуіты пачалі адкрываць для дзяцей багатых паноў collegia nobelium, падобныя піярскім, са змяненнем вучэбных праграм. Яны ўвялі ў вучэбныя планы навукі, якія б здольны былі даць вучням "карысныя" веды з жыцця: механіку практычную і тэарэтычную, рамёствы каменшчыкаў і плотнікаў, архітэктуру ваенную і грамадскую, балістыку і піратэхніку.

Гаворачы аб езуіцкай адукацыі, нельга не сказаць аб езуіцкіх тэатрах, якія існавалі пры калегіюмах і акадэміях. Праграмы тэатраў мелі адукацыйнае і прапагандысцкае прызначэнне. Развіваючыся і як сродак распаўсюджання каталіцкай веры, драма праіснавала ў езуіцкіх школах болей за 200 гадоў. П'есы ставіліся антычнай, біблейскай тэматыкі: сюжэты з жыцця святых, эпізоды з жыцця Хрыста. У Полацкай акадэміі ўпершыню была пастаўлена трагедыя "Навуходаносар"; у Пінскай калегіі "Меч Персэя", "Чорны

лебедзь, выконваючы песнь пахавання". Акрамя антычных і біблейскіх сюжэтаў, ставіліся п'есы на гістарычную тэму, напрыклад "Альгерд, вялікі князь Літоўскі" (Полацкі калегіюм), "Вянец мудрасці, злучаны з імператарскім палацам Даміцыяна, малодшага цэзара ў раду Флавіяў", "Юпітэр, арлом прыкованы" (у Навагрудку) і г.д.

Сюжэты п'ес звычайна прымеркаваны да блізкага свята: пасхі, масленіцы. Часцей за ўсё драмы і трагедыі ствараліся выкладчыкамі альбо вучнямі старэйшых класаў. Доўгія дыялогі і аратарскія здольнасці акцёра цаніліся перш за ўсё. Вялікую ўвагу ў езуіцкім тэатры ўдзялялі касцюму, маскам, дэкарацыям.

Значным элементам большасці спектакляў была музыка, якая будавалася з простых песень. Акрамя гэтага, езуіты выкарыстоўвалі такі сродак музычнага афармлення, як хор.

Сцэнічнае мастацтва езуітаў ішло ў нагу з усімі тэхнічнымі распрацоўкамі Еўрапейскага тэатра. Іх дэтальна распрацаваныя пастаноўкі часта канкурыравалі з тагачасным свецкім драматычным мастацтвам у вытанчанасці і тэхнічным майстэрстве.

Пасля далучэння Беларусі да Расіі езуіцкая сістэма навучання і выхавання зведала змяненні. У праграму калегіюмаў былі ўведзены новыя агульнаадукацыйныя прадметы. Прычым праграма малодшага аддзялення ў значнай ступені была зблiжана з праграмай галоўных народных вучылішчаў. На малодшым аддзяленні вывучаліся: закон Божы, лацінская мова, стылістыка і рыторыка, арыфметыка, геаметрыя і пачаткі алгебры, прыродазнаўчая гісторыя і мовы: руская, французская, нямецкая. Вывучэнне французскай і нямецкай было не абавязковым. Руская мова выкладалася ў першым класе і была абавязковай для ўсіх. У другім класе яе вывучалі толькі жадаючыя, у пазакласны час. Аднак на рускай мове было дадзена права выкладання гісторыі і геаграфіі, геаметрыі і архітэктуры ў сувязі з выкарыстаннем па гэтых прадметах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рускіх падручнікаў. На старэйшым аддзяленні калегіюмаў навучэнцам выкладалі філасофію, фізіку, механіку, матэматыку.

Такім чынам, праграма выкладання ў калегіюмах была грунтоўна зменена і пашырана за кошт увядзення новых агульнаадукацыйных і прыродазнаўчых дысцыплін.

Пры калегіюмах адчыняліся навіцыяты, напрыклад пры Полацкім калегіюме ў 1780 годзе. У Полацк накіроўваюцца выхадцы з розных краін свету: Італіі, Францыі, Германіі, Польшчы. Сярод іх былі выдатныя вучоныя — медыкі, механікі, мастакі, астраномы Жаба, Чалашэўскі, Газовіч, Маруты, Морыц і многія іншыя.

Колькасць вучняў у Полацкім езуіцкім калегіюме ў канцы XVIII стагоддзя ўзрасла з 80 да 120 чалавек. У гэты перыяд выкладаў вядомы Грубер, які значна ўзбагаціў нумізматычную калекцыю, аснасціў прыборамі фізічны кабінет, шмат зрабіў для выкладання жывапісу, графікі і архітэктуры. У гэты час чыталі лекцыі Д.Крукоўскі, А.Пляшчынскі, Ф.Санькоўскі, А.Маг.

Такім чынам, Полацкі калегіюм з'яўляўся навучальнай установай з поўным агульнаадукацыйным курсам навучання. Узровень выкладання ў ім у пачатку XIX стагоддзя быў даволі высокі, хаця ў сістэме выкладання адсутнічалі палітычныя навукі, абмяжоўвалася вывучэнне прыродазнаўчых дысцыплін.

Пераўтварэнне Віленскай акадэміі ў свецкі універсітэт паставіла беларускіх езуітаў перад праблемай падрыхтоўкі вышэйшых кадраў ордэна і прафесараў для калегіюмаў. Скарыстаўшы момант, езуіты здолелі дамагчыся ад Аляксандра I граматы на пераўтварэнне ў 1812 г. калегіюма ў Полацку ў акадэмію з усімі універсітэцкімі правамі і свабодамі. Акадэмія мела права прысваення ступені магістра і доктара філасофіі, незалежных навук, а таксама доктара тэалогіі і права.

Акрамя прадметаў, вывучаемых у калегіюмах, у акадэміі выкладаліся хімія, метафізіка, фізіка ўсеагульная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і вопытная, матэматыка чыстая і прыкладная, астраномія, батаніка, заалогія, мінералогія, палітычная эканомія, статыстыка, касцёльнае права, гісторыя касцёла; старажытнаяўрэйская, польская, руская, нямецкая, французская, італьянская, арабская, сірыйская мовы. Звяртала на сябе ўвагу філалагічная база акадэміі. Кожны навучэнец вывучаў сваю родную мову.

Лекцыя працягвалася адну гадзіну. Шэсць лекцый з двухгадзінным перапынкам — такі расклад існаваў па панядзелках, серадах, пятніцах і суботах. У аўторак і чацвер было толькі тры лекцыі, пасля заняткаў у гэтыя дні вучні займаліся музыкай, малюнкам, гімнастыкай.

Пры акадэміі працавала друкарня, дзе друкаваліся падручнікі і навуковыя трактаты, літаратурныя зборнікі. У Полацкай акадэміі ўбачылі свет падручнікі па лацінскай, французскай, нямецкай мовах, паэтыцы і рыторыцы, былі перавыдадзены творы Федра, Трыбуна, Цыцэрона, “Слоўнік старажытнасцей”, “Лацінска-польскі лексікон”.

Полацкая акадэмія мела вялікую бібліятэку, фізічную і хімічную лабараторыі, музей, карцінную галерэю, калекцыю гравіраваных малюнкаў, астранамічны зал. Разбіты на Дзвінскім востраве сад яшчэ ў першай палове XVIII ст. захаваў цікавыя расліны.

Залы, калідоры і кабінеты акадэміі былі ўпрыгожаны творамі графікі, скульптуры і інш. У Полацкай акадэміі вучыўся выдатны беларускі мастак В.Ваньковіч. Пасля заканчэння шостага класа Ваньковіч свабодна выконваў мініяцюры, маляваў алеем партрэты.

З Полацкай акадэміі выйшлі людзі, якія складаюць гонар беларускай культуры. Сярод іх — А.Доўгірт, палітык і прамоўца Т.Корсак, астраном і філосаф Я.Накцыяновіч, археолаг, гісторык і этнограф К.Тышкевіч, пісьменнік Я.Баршчэўскі і інш.

Сістэма выхавання і адукацыі, выпрацаваная езуітамі, была надзвычайна дзейснай. Яна заваявала папулярнасць сярод інтэлігенцыі і сацыяльнай эліты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі. У езуітаў атрымалі адукацыю шмат выдатных асоб: Мантэск'ё, Дэкарт, Карнэль, Мальер, Вальтэр. Апошняму належаць словы: "Что увидел я у иезуитов в течение 7 лет, проведенных в их заведении? Жизнь самую трудолюбивую, самую выдержанную, в любое время поглощенную то заботами о нас, то исполнением обязанностей своей суровой профессии".

Накіраванасць езуіцкай педагогікі на выхаванне гуманітарна адукаваных людзей, якія свабодна валодаюць лацінскай мовай і ўмеюць карыстацца мастацкім словам, найлепшым чынам адпавядала ўмовам шляхецкай рэспублікі, якой было ВКЛ. Сувязі з Заходняй Еўропай, літургіі ў касцёлах, судовыя працэсы, розныя соймы — усё гэта патрабавала як ведання лацінскай мовы, так і валодання прамоўніцкім і паэтычным майстэрствам.

Сёння, калі хваля перайменаванняў закранула і навучальныя ўстановы, вельмі хочацца верыць, што ўслед за адраджэннем формы прыйдзе і адраджэнне зместу. Трэба, каб пры вырашэнні стратэгічнай задачы абнаўлення вышэйшай школы ўлічвалася ўсё тое станоўчае, што стагоддзямі набывалася беларускім і іншымі народамі ў мінулым. Гэта датычыцца і навучальных устаноў езуітаў. Некаторыя іх прынцыпы выкладання, узровень выкладчыцкага саставу навучальных устаноў, тое, як езуіты ставіліся да мастацтва, безумоўна, заслугоўвае ўвагі. Характэрнай рысай гуманітарнай адукацыі езуітаў было авалоданне некалькімі мовамі, рыторыкай, паэтыкай, музыкай і інш. Вывучэнне некаторых з гэтых дысцыплін студэнтамі нашага часу будзе ствараць спрыяльныя ўмовы для фарміравання рознабаковай творчай асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ